# Герман Брэгер, Хацюхова Гісторыя невялікага паселішча, выд. "Беларускі кнігазбор". Мінск, 2001, с. 240

Беларуская гістарыяграфія ў савецкія часы практычна не займалася гісторыяй невялікіх населеных пунктаў. Дзеля гэтага аўтар рэцэнзаванай кнігі распачынаў працу з жаданьнем на прыкладзе вёскі Хацюхова паказаць багацьце гістарычнай спадчыны кожнага паселішча ў Беларусі.

Хацюхова ў XV—XVIII стагодзьдзях непарыўна было зьвязанае з маёнткам і мястэчкам Халопенічы. Толькі ў пачатку XIX ст. узьнік асобны маёнтак Хацюхова, які ўлучаў аднайменныя панскі двор і вёску, а таксама навакольныя вёскі і засьценкі.

Гісторыя Хацюхова і яго ваколіцаў паказваецца ў кнізе зь сярэдзіны XV ст., хоць у дакумэнтах Хацюхова згадваецца толькі ў 1573—1579 гг. як маёнтак Кезгайлаў. Нягледзячы на гэта, аўтар зрабіў спробу высьвятленьня верагоднай ранейшай гісторыі Хацюхова з дапамогай дакумэнтаў, якія датычаць іншых уладаньняў Кезгайлаў і іхнай генэалёгіі.

На працягу многіх стагодзьдзяў існаваньня Хацюхова з гэтым паселішчам былі зьвязаныя многія шляхецкія роды: Кезгайлы, Халецкія, Храптовічы (у тым ліку і Яхім, вялікі канцлер літоўскі і міністар замежных справаў Рэчы Паспалітай) і іншыя. Аўтар не прамінуў таксама і асобаў зь іншых сацыяльных пластоў і групаў, якія жылі ў Хацюхове і яго ваколіцах: сялянаў, мяшчанаў, стараveраў, габрэяў і немцаў.

Гісторыю Хацюхова аўтар давёў да 1917 г. Апошнім уладальнікам маёнтку быў Вікенці Брадоўскі. Апошнія два разьдзелы сваёй працы аўтар прысьвяціў радаводам Брадоўскіх гербу Ладзьдзя і Лада.

Кніга мае сьпіс апублікаваных і архіўных крыніцаў, якія выкарыстоўваліся пры напісаньні працы, а таксама паказальнік імёнаў і геаграфічны паказальнік.

Пішучы сваю кнігу, Г. Брэгер правёў надзвычай старанныя архіўныя пошукі. Ён выкарыстаў зборы Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі ў Менску: кнігі судовых актаў Ашмянскага павету зь сярэдзіны XVII да канца XVIII ст., матэрыялы фонду "Архіў князёў Радзівілаў" за II палову XVI—XVII ст., мікрафільмы дакумэнтаў канцылярыі вялікага князя літоўскага (Літоўская Мэтрыка) XVI—XVII стст., разнастайную дакумэнтацыю дзяржаўных установаў Барысаўскага павету і Менскай губэрні з канца XVIII ст. да 1917 г. Таксама аўтар выкарыстаў паасобныя дакумэнты, якія захоўваюцца ў Гістарычным архіве Літоўскай Рэспублікі ў Вільні і аддзеле рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Акадэміі навук Украіны. Як аўтар сам сьцьвярджае, з розных прычынаў ён ня здолеў выкарыстаць фондаў згаданых установаў (а таксама Расейскага дзяржаўнага гістарычнага архіву ў Пецярбургу) цалкам. Аднак жа і без таго вынікі архіўных пошукаў, праведзеных аўтарам, значныя — у працы былі выкарыстаныя амаль 300 архіўных справаў.

Праца Г. Брэгера — беспрэцэдэнтная ў беларускай гістарыяграфіі. Яна можа служыць узорам для ўсіх беларускіх гісторыкаў, якія займаюцца гісторыяй асобных мясцовасьцяў.

*Перакладзена з польскай мовы паводле:*
Białoruskie Zeszyty Historyczne. 2003. Z. 19. S. 287—288.